■ Невядомае пра вядомых

# ВЯЛІКІ ТАЛЕНТ, ВЯЛІКАЯ ТАЯМНІЦА

## Постаць Кузьмы Чорнага – вачыма сучаснікаў, вучняў і нашчадкаў

**Яго называюць першым раманістам у беларускай літаратуры, а таксама — нашым Дастаеўскім і нашым Стэйнбекам. Удумлівы апавядальнік і глыбокі псіхолаг, Кузьма Чорны (сапраўднае імя Мікалай Раманоўскі) за свой кароткі жыццёвы век здолеў у раманах адлюстраваць лёсы некалькіх пакаленняў беларусаў, стаць у шэраг нацыянальных класікаў, а таксама ўзняць айчынную прозу на сусветны ўзровень. Але ці шмат мы ведаем пра самога пісьменніка, яго жыццёвую дарогу? Напэўна, не. Таму кніга «Кузьма Чорны. Чалавек — гэта цэлы свет», што выйшла ў свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў межах знакамітай серыі «ЖЗЛБ», стане для айчыннага чытача адкрыццём. Перадусім — адкрыццём асобы класіка. Пра тое, якія матэрыялы ўвайшлі ў гэтае выданне, як ішла праца над праектам мы гутарым з укладальніцай кнігі, загадчыкам аддзела літаратурна-мастацкіх праграм Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё Галінай ШАБЛІНСКАЙ.**


Кузьма Чорны з дачкой Рагнедай, 1938 г., фота з сямейнага архіва Міколы Раманоўскага.

**— Галіна Васілеўна, вы ўжо выступалі ў якасці ўкладальніка кніг серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі». Склалі тамы, прысвечаныя Янку Купалу і Уладзіміру Караткевічу. Чаму менавіта Кузьма Чорны цяпер прыцягнуў вашу ўвагу?**

— Постаць Кузьмы Чорнага мяне цікавіла даўно. Здавалася б, хрэстаматыйны аўтар, але мы ведаем пра яго да крыўднага мала. Вельмі хацелася паглыбіцца ў той час, які спраўдзіў Чорнага як мастака і разам з тым не даў яму цалкам рэалізавацца. Вялікі талент — гэта заўсёды вялікая таямніца. І мяне кожны раз дзівіць тая сіла супрацьстаяння часу, абставінам, лёсу, якой валодаюць таленавітыя людзі (на жаль, не ўсе). Я, можа, выкажу парадаксальную думку, але Купала, Караткевіч і Чорны — блізкія ў выяўленні свайго боскага творчага дару. Паглядзіце, у кожнага з іх — кароткі зямны век: 60, 54 і 44 гады адпаведна. Яны перажылі палітычныя ўціскі свайго часу, а то і рэпрэсіі, і праз усе выпрабаванні — такое ахвярнае служэнне беларускаму слову і Бацькаўшчыне. Мы вымаўляем гэтыя імёны і чуем — Беларусь. У лёсе кожнага з іх ключавое слова — мужнасць. І да Чорнага яно стасуецца ў асаблівай ступені.

**— Якія крыніцы матэрыялаў выкарыстоўвалі ў працы? У якіх архівах, бібліятэках працавалі?**

— Тут я хацела б падкрэсліць, што мэта гэтага выдання — расказаць пра Кузьму Чорнага як чалавека, прасачыць лінію жыцця творцы. Таму ў кнізе пераважае мемуарны жанр. І канешне, галоўныя апавядальнікі яго жыццёвай і творчай біяграфіі — сучаснікі пісьменніка. Іх успаміны параскіданы па самых розных крыніцах, у тым ліку — шмат у перыёдыцы, пачынаючы з пасляваенных гадоў. Па сутнасці, гэта былі першыя эмацыянальна-балючыя водгукі светлай памяці Чорнага, які памёр у лістападзе 1944 года.

> «Гэтую кнігу трэба браць ў рукі і чытаць. Яна, сапраўды, адкрывае нам невядомага класіка, набліжае яго постаць і ўзвышае».

А працаваць даводзілася ў розных месцах. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна, іншыя архіўныя і музейныя ўстановы. Нават у фондах Беларускага радыё я знайшла некалькі цікавых успамінаў пра Кузьму Чорнага, якія былі запісаны яшчэ ў 1960–1970-я гады: Алеся Пальчэўскага, Антона Бялевіча, Міколы Хведаровіча ў выкананні аўтараў. Потым я прачытала надрукаваныя варыянты і калі іх супаставіла, аказалася, што аўдыёзапісы — больш родныя.

**— Многія дакументы, фотаздымкі, што ўвайшлі ў кнігу, сапраўды ўнікальныя, яны дадаюць новыя рысы да асобы Кузьмы Чорнага. Што менавіта для вас было нечаканасцю, адкрыццём у постаці і лёсе класіка?**

— Сышла забранзавеласць класіка, і адкрылася жывая асоба з любоўю, болем, роздумам, пакутамі. Нават яго партрэт на супервокладцы кнігі, калі вы звярнулі ўвагу — зусім не падобны на тыя зарэтушаваныя, што мы бачылі раней. Хтосьці з маіх калег сказаў — твар еўрапейскага класіка. А Кузьма Чорны і ёсць такім.

Вядома, што 8 месяцаў турмы моцна падарвалі здароўе Чорнага і скарацілі яго век, але ўражвае тая прага да працы, якая ніколі яму не здраджвала, ні пры якіх жыццёвых абставінах. Якую сілу волі трэба было мець і якое жаданне пісаць, каб працаваць да апошняга ўздыху і верыць у тое, што ты робіш. І гэты яго апошні запіс у дзённіку, зроблены ў дзень смерці: «Божа, напішы за мяне мае раманы, хіба так маліцца, ці што?..», які цяпер часта цытуюць, гучыць як прысуд пісьменніцкага лёсу, той Галгофы, якую ён прайшоў...

> «Іван Мележ лічыў яго сваім настаўнікам, талент празаіка Кузьма Чорны разгледзеў у зусім яшчэ маладога Янкі Брыля».

**— А якія дакументы, здымкі мы бачым у кнізе ўпершыню?**

— Некалькі фотаздымкаў з сямейнага архіва, аўтографы лістоў Чорнага да Пятра Глебкі, Адама Бабарэкі, Якуба Коласа, дароўныя надпісы пісьменніка на яго кнігах, рукапіс верша Юркі Гаўрука «Памяці Кузьмы Чорнага» 1945 года, фотаздымак пасмяротнай маскі пісьменніка. Асабіста мяне вельмі крануў дакумент з сямейнага архіва, які падрыхтаваў да друку ў гэтай кнізе ўнук Мікола Раманоўскі. Гэта «Хроніка хваробы Кузьмы Чорнага» — запісы жонкі Рэвекі Свераноўскай, якія былі зроблены ёю, калі ў Чорнага здарыўся першы інсульт у канцы 1942 года ў Маскве. І ліст дачкі пісьменніка Рагнеды да Якуба Коласа, які быў напісаны дзяўчынкай-падлеткам таксама недзе ў гэты перыяд (пісьмо без даты). Яго нельга чытаць без хвалявання. Пра ўсё не раскажаш. Гэтую кнігу трэба браць у рукі і чытаць.


Рэдкалегія часопіса «Узвышша». Сядзяць: Кузьма Чорны, Уладзімір Дубоўка, Кандрат Крапіва. Стаяць: Адам Бабарэка, Язэп Пушча. Мінск, 1927 г., фота з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

**— Наколькі плённай была супраца з унукам Чорнага, перакладчыкам Міколам Раманоўскім?**

— Я ўдзячна спадару Міколу за дапамогу ў падрыхтоўцы гэтай кнігі. Ён вельмі адказна паставіўся да маёй прапановы «зазірнуць у сямейны архіў». Спадар Мікола вельмі беражлівы, я б сказала, расчытаў запісы сваёй мамы Рагнеды Мікалаеўны «Мінулае», яны друкуюцца ўпершыню. Ім былі падрыхтаваны лісты Кузьмы Чорнага, якія захоўваюцца менавіта ў сямейным архіве, і гэта зноў — адкрыццё для чытача. Ён шчодра прапанаваў нам матэрыял для ілюстрацыйнага афармлення выдання, шмат цікавага расказаў пра свой род у інтэрв'ю. Мне імпануюць яго адносіны да справы ўшанавання памяці пра дзеда.

**— Многія з пісьменнікаў-сучаснікаў успамінаюць пра Чорнага як пра вельмі тактоўнага настаўніка-дарадцу. Пішуць, што ён з цярплівасцю чытаў іх творы, рабіў слушныя заўвагі, нават хворы працаваў і запрашаў іх дадому ў новую кватэру па вуліцы Свярдлова. Якім творцам Кузьма Чорны даў пуцёўку ў вялікую літаратуру?**

— Фактычна, гэта ўсё маладзейшае пакаленне, якое прыйшло ў беларускую літаратуру пасля Кузьмы Чорнага ў 1920-я і 30-я гады. Нездарма яго называлі хросным бацькам літаратурнай моладзі. Іван Мележ лічыў яго сваім настаўнікам, талент празаіка Кузьма Чорны разгледзеў у зусім яшчэ маладога Янкі Брыля. Алесь Пальчэўскі, Антон Бялевіч, Іван Грамовіч, Павел Пруднікаў, Рыгор Няхай, Мікола Хведаровіч, Усевалад Краўчанка, Уладзімір Хадыка — спіс можна доўжыць. Праца з творчай моладдзю — гэта асаблівы дар, а ў Чорнага не было «дзяжурнага» стаўлення да маладых, усё ішло ад сэрца, і яны гэта цудоўна адчувалі.

**— Ёсць у выданні і лісты пісьменніка да яго сяброў і паплечнікаў — Васіля Віткі, Пятра Глебкі, Пімена Панчанкі, Адама Бабарэкі і многіх іншых. Ці сапраўды Кузьма Чорны прыцягваў да сябе людзей?**

— Так, цэлы раздзел у кнізе прысвечаны ліставанням Чорнага з рознымі людзьмі. Вядома, што пісьмаў пісьменнніка ўвогуле захавалася не так і шмат. Тым больш, я думаю, будзе цікава прачытаць іх у гэтай кнізе. А пра тое, што Чорны валодаў магнетызмам прыцягваць да сябе людзей, згадваюць многія. Гэта зайздросны талент глыбокіх натур. Хоць на пустыя размовы марнаваць час не хацеў. Інакш бы ён не паспеў столькі напісаць.

**— Наколькі гучным было яго імя ў свой час, а меркаванне — аўтарытэтным?**

— Гэта было адно з самых яркіх імёнаў у свой час. Да яго думкі заўсёды прыслухоўваліся, у сваіх крытычных ацэнках ён не крывадушнічаў, а густу і таленту яму было не пазычаць. І Чорнаўскае «будзе друкавацца» для маладых гучала як пароль, як надзея, што яны абавязкова будуць працаваць у беларускай літаратуры.

**— У некаторых рукапісах, вывы якіх можна пабачыць у кнізе, пісьменнік паўстае і ў вобразе мастака. Тут ёсць малюнкі, накіды ілюстрацый. А як сам Кузьма Чорны ставіўся да сваіх мастакоўскіх эксперыментаў?**

> «Спадчына Кузьмы Чорнага вяртае нас да спрадвечнага: зямля, чалавек, свет».

— На жаль, такой інфармацыяй я не валодаю. Магу толькі меркаваць, што яму было цікава ілюстраваць уласныя творы. У гэтым таксама выяўлялася яго творчая натура. Шкада, што мала захавалася малюнкаў. Таленавітыя людзі — таленавітыя ва ўсім... Дарэчы, Кузьма Чорны быў і музычна адораным чалавекам.

**— Раман Чорнага «Пошукі будучыні» не так даўно быў выдадзены ў серыі «Мая беларуская кніга», выбраныя творы ва ўкладанні Міхася Тычыны выйшлі на пачатку 2000-х у серыі «Беларускі кнігазбор», а збор твораў класіка ў 8 тамах пабачыў свет аж у 1970-я. Ці ёсць патрэба ў новым зборы твораў?**

— Сюды можна таксама дадаць том твораў Чорнага ў «Залатой калекцыі беларускай літаратуры», які выйшаў летась у «Мастацкай літаратуры». Быў пазнейшы збор твораў класіка ў 6 тамах, у 1990-я гады. І тым не менш патрэба, як вы кажаце, у новым зборы твораў Кузьмы Чорнага ёсць. Пра што, дарэчы, гаворыць у гэтай кнізе і ўнук пісьменніка Мікола Раманоўскі.

**— Можна сцвярджаць, што творы Чорнага могуць здабыць новую хвалю папулярнасці і быць наноў адкрытымі нашымі сучаснікамі?**

— Класічныя творы, як вядома, пішуцца «навырост». І новае прачытанне класікі адбываецца ў кожнага пакалення. Спадчына Кузьмы Чорнага вяртае нас да спрадвечнага: зямля, чалавек, свет. І колькі будзе жыць чалавек на зямлі, ён будзе шукаць сваё месца ў гэтым свеце, будзе любіць свой дом і свой край, каб зразумець і спраўдзіць сваё «я».

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

**А як унук пісьменніка ўспрыняў новую кнігу, якая распавядае пра яго дзядулю? Якія выданні пра Чорнага яму хацелася б пабачыць і якія адкрыцці ў вывучэнні жыццёвай дарогі класіка нас яшчэ чакаюць? На гэтыя пытанні адказвае ўнук Кузьмы Чорнага Мікола РАМАНОЎСКІ:**

— Новая кніга грунтоўная і добра выдадзеная. Успамінаў за дзесяцігоддзі набралася шмат, але ўсе былі раскіданыя па розных выданнях; лісты не былі сабраныя дагэтуль ніколі, крытыка — таксама. Дзякуй укладальніцы, дызайнеру, выдаўцам. Пашкадаваць можна хіба пра тое, што аб'ём не бязмежны і не ўсё ўдалося ўключыць. Прыкладам, не ўвайшлі дзённікі і фрагменты з лістоў Васіля Віткі ваеннага часу, а гэта (асабліва дзённікі) — унікальныя сведчанні пра тое, як жыла рэдакцыя газеты «Савецкая Беларусь», дзе працаваў дзядуля, на пачатку вайны вандруючы па расійскіх гарадах, а потым атабарыўшыся, некаторыя фотаздымкі і лісты — Чорнага і іншых асоб; мемуарныя запісы Рагнеды Раманоўскай (дачкі); колькі шпітальных запісаў самога Чорнага дзённікавага характару. Мабыць, упершыню ў добрай якасці публікуюцца факсіміле рукапісаў.

Увага да спадчыны Чорнага сёння недастатковая, дый, зрэшты, не толькі да яе. Але перыядычна сустракаю ў інтэрнэце, як той ці іншы чалавек піша, што чытае Чорнага, — і як жа добра, ці шукае парады, што значаць у Чорнага тыя ці іншыя словы і выразы. Вось такая цікавасць «знізу» надзвычай каштоўная.

Што да пакуль не апублікаваных матэрыялаў, пра якія мне вядома, то яны цікавыя хутчэй не для даследчыка творчасці, а для біёграфа: афіцыйныя паперы, запісы з нататніка... Мастацкія творы апублікаваныя ўсе, якія толькі захаваліся, нават, здаецца, з лішкам (перадрукоўваўся пад імем Чорнага, але не ўвайшоў у зборы твораў верш, напісаны, пэўна, нейкім ягоным фамільятам, бо сам ён вершаў не пісаў ніколі). Застаюцца неапублікаванымі два пераклады п'ес (Астроўскага і Горкага), неперадрукаванымі ў нашы дні — астатнія пераклады. У зборы твораў у 8 тамах 1970-х гадоў была апублікаваная хроніка жыцця і творчасці Чорнага, але цяпер яе трэба рабіць фактычна нанава: за савецкім часам шмат пра што і пра каго немагчыма было згадаць.

Таму, мне здаецца, не хапае найперш поўнага збору твораў Кузьмы Чорнага — з лістамі, перакладамі, нанава зверанага з першадрукамі і рукапісамі. Не хапае электроннага выдання — дагэтуль у інтэрнэце толькі адзінкавыя аповесці і апавяданні. Не хапае слоўніка мовы Чорнага . Ёсць багата біяграфічных матэрыялаў, але грунтоўнай біяграфіі няма. Дарэчы, Чорным жа займаліся не толькі літаратуразнаўцы, а і мовазнаўцы, літаратуразнаўчая анталогія ў новай кнізе прадстаўленая, а мовазнаўчую яшчэ, мабыць, варта сабраць. Страшэнна расчароўваюць пераклады Чорнага на рускую мову, якія рабіліся за савецкім часам. Мова там прадказальна знівеляваная, да таго ж шмат павыкрэслівана. Ніякага ўяўлення пра тое, за што ў нас цэняць Чорнага, гэткія пераклады даць не могуць. А рабіць нанава — гэта вялікі выклік для перакладчыка, бо трэба фактычна ствараць з нуля расійскі адпаведнік чорнаўскаму стылю. Пры тым, што беларуская і руская стылістыка збудаваныя зусім па-рознаму.

---

**Крынічка**

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Пырнік, снітка, макрыца, асот — «гарачая пяцёрка» самых трывалых**

## ЗМАГАННЕ З ПУСТАЗЕЛЛЕМ: ЯК ПЕРАМАГЧЫ САМЫХ ЖЫВУЧЫХ

### Асот

Мабыць, самая непрыемная для прапалкі расліна. Перашкаджаюць і калючае сцябло, і магутны корань даўжынёй да 18 см. А калі спазніцца з прапалкай, то насенне-лятучкі за адзін сезон засеюць увесь участак!

*Спосабы барацьбы*

***Механічныя***. Звычайная прапалка патрабуе сілы (выцягваць корань з зямлі), садовых пальчатак і педантычнасці — бо калі вы пакінеце ў зямлі хоць бы пяцісантыметровы кавалачак кораня, пустазелле хутка зноў адрасце. На ўчастках, якія не вельмі кідаюцца ў вочы, можна не палоць, а метадычна касіць пустазелле, гэта знясіліць яго.

***Народныя***. Замульчыруйце глебу — пілавіннем, саломай, плёнкай. Міжраддзі і прастору пад дрэвамі можна заслаць спецыяльным матэрыялам — аграспанам (гэта чорная тканіна, якая перашкаджае з'яўленню пустазелля).

***Хімічныя***. Знішчыць асот дапамогуць «Раўндап» або «Латрэл». Праўда, прымяняць іх варта толькі на газонах, уздоўж плота і дарожак. Не дапускайце пападання хімікатаў на лісце і парасткі культурных раслін!

### Снітка

Сапраўднае бедства для саду. З дапамогай доўгіх жывучых каранёў хутка размнажаецца і асвойвае ўсё новыя і новыя плошчы. Прапалка бескарысная — расліна пранізвае каранямі 40-сантыметровы пласт глебы! І дае парасткі з найменшага кавалачка кораня.

*Спосабы барацьбы*

***Механічныя***. Поўнае глыбокае перакопванне пласта глебы, кожны корань трэба выбраць. Распаўсюджванне сніткі можна стрымліваць, укапаўшы ў зямлю пластыкавую садовую стужку на глыбіню не менш за 20 см. А каб расліна не размнажалася самасевам, трэба касіць траву і абрываць кветканосы.

***Народныя***. Рэкамендуецца да вясны наступнага года прыкрыць чорнай плёнкай, кардонам або аграспанам моцна заражаныя ўчасткі. Без сонечнага святла большасць раслін загіне. Другі спосаб — пасадзіць бульбу (снітка не выносіць абгонкі).



***Хімічныя***. Супраць сніткі рэкамендуюць прэпараты «Раўндап», «Кілер», «Тарнада». Толькі апрацоўваць жывучае пустазелле давядзецца некалькі разоў за сезон. Праводзіць «хімічную атаку» лепш ясным бязветраным днём. Сцеражыцеся пападання прэпаратаў на лісце і парасткі дэкаратыўных і ядомых раслін.

### Макрыца

Пустазелле-індыкатар, паказвае, што глеба на вашым участку занадта кіслая, ды і сонца на ўчастку замала. Дзякуючы жывучасці пустазелля змагацца з ім даводзіцца ўсё лета. Макрыца пастаянна цвіце і здольная змяніць некалькі пакаленняў за сезон.

*Спосабы барацьбы*

***Механічныя***. Выполваць гэтую няпрошаную госцю вельмі складана. Нават маленькі лісточак або кавалачак сцябла, што застаўся ў зямлі, здольныя вельмі хутка даць новую расліну. Тонкае сцябло рвецца пры прапалцы і яшчэ лепш укараняецца, а праз некалькі тыдняў з'яўляюцца новыя ўсходы. Ссякайце зелле матыкай або пласкарэзамі, як толькі заўважыце. Галоўнае — не дапускаць цвіцення!



***Народныя***. Працей за ўсё стварыць пустазеллю невыносныя ўмовы: восенню пры перакопванні ўнесці ў глебу вапну або мел, попел. Попел можна ўжываць у любы час. Такі спосаб значна знізіць кіслотнасць, і макрыца пакіне ўчастак сама сабой.

***Хімічныя***. Цалкам знішчае макрыцу «Раўндап». Выкарыстоўваючы хімікат, дакладна прытрымлівайцеся інструкцыі, захоўвайце бяспечную дазіроўку і правілы апрацоўкі. Уліччыце — «хімію» нельга прымяняць на градках і ў пладовым садзе, хіба толькі восенню падчас перакопкі.

### Пырнік паўзучы

Неверагодна ўпартая расліна, якая выжывае ў любых умовах. А прычынай усяму карані, якія пранікаюць на глыбіню да 1 м. Адна расліна здольна даць 10 000 зярнятак насення, якое прарастае ўжо праз два тыдні. Пырнік заваблівае ў агарод шкодных насякомых — драцяніка, гесенскую муху і сцябловую соўку.

*Спосабы барацьбы*

***Механічныя***. Лепшы спосаб знішчэння пустазелля — гэта перакапаць участак віламі на вельмі вялікую глыбіню (да 30 см) і старанна пры гэтым выбраць рукамі карані. Нават маленькі адростак можа засмеціць увесь агарод. Выпалатыя расліны вынесіце за тэрыторыю і спаліце.

***Народныя***. Вельмі добра прыгнятае пырнік газонная трава. Моцна заражаныя ўчасткі рэкамендуюць заняць пад газон або проста засеяць канюшынай. Можа дапамагчы і мульчыраванне — пілавіннем, саломай, аграперлітам (пакідаючы крыжападобныя прарэзы для карысных культур).

***Хімічныя***. У ясную пагоду апырскваюць пустазелле «Раўндапам». Калі расліны пажоўкнуць (праз 7-10 дзён), перакопваем глебу і выдаляем карані. На газоне, дзе пустазелля няшмат, прэпарат можна наносіць пэндзлікам. «Хімія» не павінна трапіць на лісце і парасткі культурных раслін.

---

Даты | Падзеі | Людзі

**8 ЧЭРВЕНЯ**

**1781** год — 235 гадоў таму нарадзіўся Юзаф Дашчынскі, беларускі піяніст, кампазітар, дырыжор, педагог. Пачынаючы з 1813 года выкладаў музыку ў Віленскім універсітэце. У 1814-м пераехаў у Гарадзішча пад Мінскам, дзе амаль 30 гадоў узначальваў сімфанічны аркестр, даваў урокі фартэпіяннай ігры. Аўтар каля 100 музычных твораў, выдадзеных у Маскве, Вільні, Варшаве, Вене, Лейпцыгу. Памёр у 1844 годзе.

**1895** год — нарадзіўся (вёска Погіры, цяпер у Дзятлаўскім раёне) Ігнат Сямёнавіч Дварчанін, беларускі літаратуразнаўца, паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. З 1919 года вёў культурна-асветніцкую работу. З 1926 года — у Вільні на выкладчыцкай рабоце. У 1928–1930 гадах быў адным з кіраўнікоў галоўнага ўпраўлення ТБШ. У 1928-м абраны паслом у Польскі сейм. За рэвалюцыйную дзейнасць арыштаваны польскімі ўладамі, у 1930 годзе асуджаны, вызвалены ў 1932-м у выніку абмену палітвязнямі. Працаваў у камісіі АН Беларусі па вывучэнні Заходняй Беларусі. Аўтар вершаў, публіцыстычных твораў. У 1927 годзе выдаў у Вільні «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 г.)» для сярэдніх школ, якая адыграла вялікую ролю ў навучанні і патрыятычным выхаванні. Пераклаў на беларускую мову паэму А. Блока «Дванаццаць». У 1933 годзе рэпрэсаваны, у 1937-м расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

**1920** год — нарадзіўся Іван Кажадуб, савецкі ваенны лётчык і ваенны дзеяч, Маршал авіяцыі, тройчы Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну ў знішчальнай авіяцыі, камандзір эскадрыллі, намеснік камандзіра палка. Удзельнічаў у 120 паветраных баях, збіў 62 самалёты праціўніка. Распрацаваў шэраг новых прыёмаў і спосабаў вядзення паветранага бою. Яго імем названы вуліцы ў Магілёве і Рагачове.



**Было сказана**

**Янка КУПАЛА, народны паэт Беларусі:**
*«К праўдзе ўвагі не знае, не чуе,
Як змяя, чалавечая злосць».*

---

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 4.39 | 21.39 | 17.00 |
| Віцебск | 4.21 | 21.37 | 17.16 |
| Магілёў | 4.29 | 21.29 | 17.00 |
| Гомель | 4.35 | 21.16 | 16.41 |
| Гродна | 4.56 | 21.52 | 16.56 |
| Брэст | 5.06 | 21.44 | 16.38 |

**Месяц**

*Маладзік 05.06–11.06.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

**Імяніны**

*Пр. Алены, Георгія, Івана, Макара.*
*К. Ады, Ядвігі, Вільгельма, Максіма.*


Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




---

## УСМІХНЕМСЯ

**Тры дні не могуць спыніць дзяўчынку, якая скача на батуце ў пакоі з нацяжной столлю.**

Муж вяртаецца ад урача і кажа жонцы:
— Мне доктар сказаў, што да раніцы не дажыву. Давай усю ноч будзем піць шампанскае і займацца сексам!
— Бач, які разумны! Табе ж раніцай не ўставаць...

**Усё ж такі добра, калі ў сям'і ёсць агульныя інтарэсы. Ён любіць рыбалку, а яна — калі ён на рыбалцы.**

Неяк вырашыў павесяліцца: у рэзюмэ, у графе «станоўчыя якасці», напісаў — адсутнасць сумлення. І тут жа сталі прапаноўваць та-а-акія пасады...



Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2317.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 чэрвеня 2016 года.